**Вучэбная дысцыпліна «Камунікатыўная семантыка тексту»**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята<br>(агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0232 -01 Беларуская філалогія<br>Капмпанент установы вышэйшай адукацыі |
| **Кароткі змест** | Тэкст як камунікатыўная адзінка. Тэкст як працэс (дыскурс) і вынік маўлення (твор). Сэнсавая, камунікатыўная і структурная цэласнасць тэксту ў канцэпцыі В.І. Маскальскай. Цэласнаць і звязнасць як галоўныя ўласцівасці тэксту. Асноўныя ўласцівасці тэксту ў інтэрпрэтацыі Л.М. Мурзіна і А.С. Штерн. Суадносіны паміж формай, зместам і функцыяй тэксту. Функцыі тэксту як маўленчага твора. Тэкст як дынамічная з'ява: сучасныя праблемы вывучэння працэсаў спараджэння і ўспрымання тэксту. Функцыі тэксту як дынамічнай з'явы. Класіфікацыі тэкстаў. Паняцце тыпу тэксту, суадносіны паняццяў тып, жанр і стыль тэксту. Традыцыйныя класіфікацыі маўленчых твораў. Характарыстыка асноўных прыкмет і катэгорый тэксту. Граматыка тэксту. Семантыка тэксту. Паняцце прагматыкі тэксту: выяўленне асаблівасцей тэксту з пункту гледжання суб'екта адрасата маўлення. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | Базавыя прафесійныя кампетэнцыі: ведаць: нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы; асноўныя кампазіцыйна-маўленчыя формы і асаблівасці іх пабудовы ў пісьмовым і вусным маўленні; асноўныя метады і прыёмы розных тыпаў вуснай і пісьмовай камунікацыі; асноўныя патрабаванні, што прад'яўляюцца да складання паведамленняў і дакладаў; а таксама правілы вуснага, пісьмовага і віртуальнага (размяшчэнне ў інфармацыйных сетках) прадстаўлення матэрыялаў уласных даследаванняў; умець: ствараць і рэдагаваць тэксты прафесійнага прызначэння на беларускай мове; правільна выкарыстоўваць асноўныя кампазіцыйна-маўленчыя формы і асаблівасці пры пабудове пісьмовых і вусных тэкстаў; выкарыстоўваць розныя тыпы вуснай і пісьмовай камунікацыі; складаць паведамленні і даклады; а таксама прадстаўляць матэрыялы ўласных даследаванняў у вуснай, пісьмовай і віртуальнай (размяшчэнне ў інфармацыйных сетках) формах; карыстацца спосабамі аналізу і ўзнаўлення інфармацыі з улікам норм беларускай літаратурнай мовы. |
| **Прэрэквізіты** | "Уводзіны ў мовазнаўства". |
| **Працаёмкасць** | 3 заліковыя адзінкі, 90 акадэмічных гадзін, з іх 34 аўдыторныя: 20 г лекцый і 14 г практычных заняткаў. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 3-й семестр, залік. |